УДК 159.924.24+[791.633:37.016]

***Н. К. Авяркова,***
*старшы выкладчык кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

# МАСТАЦКАЕ СЛОВА Ў ВЫХАВАННІ ПРАФЕСІЙНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ РЭЖЫСЁРА СВЯТ

**Анатацыя.** Разглядаецца сутнасць фарміравання прафесійных кампетэнцый рэжысёра свят (тэатралізаваных прадстаўленняў) на занятках па мастацкім чытанні. Паказваецца шлях увасаблення літаратурнага матэрыялу ў жывое дзейснае слова.

**Ключавыя словы:** уяўленне, фантазія, вобразнае мысленне, эмацыянальная чуласць, мастацкае слова, звышзадача, аб'екты апавядання, зносіны.

***N. Averkova,***
*Senior Lecturer of the Department of directing of the Educational Institution*
*"The Belarusian State University of Culture and Arts"*

# ARTISTIC WORD IN EDUCATION OF PROFESSIONAL COMPETENCIES OF FESTIVAL'S DIRECTORS

**Abstract.** The article considers the essence of the formation of professional competencies of the director of the festivals (theatrical performances) in art reading classes; shows the way of embodiment of literary material into a living active word.

**Keywords:** imagination, fantasy, figurative thinking, emotional sensitivity, artistic word, overriding task, narrative objects, communication.

Адным з галоўных напрамкаў у комплекснай падрыхтоўцы рэжысёра свят (тэатралізаваных прадстаўленняў) з'яўляецца авалоданне студэнтамі законамі слоўнага дзеяння ў разнастайных літаратурных жанрах святочнай практыкі. Мастацкае слова – адзін з відаў вербальнага дзеяння, што адыгрывае вялікую ролю ў выхаванні выканальніцкіх, педагагічных і рэжысёрскіх навыкаў.

Таму ад вернага разумення яго месца і значэння ў сістэме навучання будучых рэжысёрскіх кадраў залежыць эфектыўнасць авалодання навыкамі моўнага ўзаемадзення. Адсюль узнікае неабходнасць разгледзець сутнасць уплыву мастацкага

чытання на прафесійнае станаўленне рэжысёраў свят (тэатралізаваных прадстаўленняў), кіраўнікоў і ўдзельнікаў калектываў мастацкага слова, агітбрыгад, а таксама вядучых свят і канцэртных праграм.

Дзейнасць рэжысёра свят (вядучага, выканаўцы, акцёра) заўсёды звязана з мастацтвам вуснага літаратурнага слова. І гэта ўзаемасувязь склалася ў выніку самой практыкі. На працягу свайго існавання рэжысёрская і акцёрская школы выкарыстоўвалі і працягваюць выкарыстоўваць матэрыял чытальніцкага мастацтва як сродак выяўлення і фарміравання творчай індывідуальнасці, развіцця творчага дыяпазону студэнта, навучання яго слоўнаму дзеянню, выхавання духоўнай асобы ў цэлым. Акрамя гэтага, у практычнай дзейнасці рэжысёру свят часта даводзіцца браць на сябе і функцыі педагога чытальніцкага матэрыялу. Таму засваенне асноў мастацтва вуснага літаратурнага слова з'яўляецца абавязковым у навучанні будучых спецыялістаў гэтай галіны.

Мастацтва вуснага літаратурнага слова – гэта мастацтва аднаўлення ў жывым гучанні пачуццяў і думак, якімі насычаны літаратурны твор; мастацтва выказвання асабістых адносін чытальніка да абранага твора; мастацтва здзяйснення яго волі, намеру, што праяўляюцца ў выкананні.

Шлях мастацкага ўвасаблення літаратурнага твора ў вуснае апавяданне – гэта доўгі працэс аналізу тэксту, спасціжэння задумы аўтара, сучаснае пераасэнсаванне ім падзей і г. д. Канчатковы вынік такой працы – нараджэнне яркага, выразнага, эмацыянальнага, дзейснага слова. Як сцвярджаў К. С. Станіслаўскі: «Трэба вучыцца мастацтву гаварыць, гэта значыць дзейнічаць. Дзейнічаць дзеля нейкага аб'екта, дзеля якойсьці мэты (жывога аб'екта на сцэне ці ў глядзельнай зале)» [8, с. 340].

На кафедры рэжысуры адным з галоўных і актуальных прынцыпаў падрыхтоўкі будучых спецыялістаў застаецца непарыўная сувязь прафесійнага навучання з ідэйным і духоўным выхаваннем. У гэтым працэсе выкладчыкі кафедры звяртаюць асаблівую ўвагу на фарміраванне грамадзянскай пазіцыі будучага рэжысёра; развіццё фантазіі, уяўлення, вобразнага мыслення; навыкі практычнага карыстання шырокай палітрай выразных сродкаў свята.

У аснове мастацтва выканаўцы знаходзіцца літаратура, глыбокае пранікненне ў якую справядліва лічаць адным з вызначаючых фактараў станаўлення творчай асобы, фарміравання яе актыўнай жыццёвай пазіцыі. Мастацкае слова фарміруе светапогляд студэнта наступнымі сродкамі: літаратурным матэрыялам, які ён выкарыстоўвае ў сваёй працы, і звышзадачай, што збліжае яго асобу з асобай аўтара. «Выканаўца прызваны ў жывой гутарцы перадаць слухачам думкі і пачуцці аўтара. Ён не можа не падзяляць з аўтарам яго высокай місіі. Бо кожны пісьменнік і паэт у той альбо іншай ступені мысліцель, філосаф, чалавек вялікага розуму і сэрца. У працэсе непасрэднага ўвасаблення літаратурнага слова студэнт-выканаўца абавязкова ўнутрана збліжаецца з асобай аўтара, так альбо іначай "дацягваецца", расце да ўзроўню аўтарскага светаразумення. Сапраўдная ж вера ў перакананне аўтара як у сваё асабістае садзейнічае не толькі назапашванню і пашырэнню ведаў студэнтаў, але і развіццю іх светапогляду, бо веды, набыўшы характар перакананняў, ператвараюцца ў светапогляд» [3, с. 20].

Вуснае літаратурнае слова развівае мысленне будучага рэжысёра. Задачы ўвасаблення літаратурнага твора ў вуснае слова патрабуюць ад выканаўцы актыўнай разумовай дзейнасці. Плён такой работы праяўляецца ў спасціжэнні твора, мысленным узнаўленні падзей і з'яў, перадачы іх слухачу са сваімі і аўтарскімі поглядамі, знаходжанні канкрэтных выразных сродкаў і пераўтварэнні іх у агучанае слова. Гэта праца трэніруе, удасканальвае лагічнае і вобразнае мысленне.

Творчая работа над тэкстам адначасова развівае і ўяўленне студэнтаў. «Мастацкае чытанне – гэта "тэатр уяўлення". Па асобных штрыхах, дадзеных выканаўцам, слухач ва ўяўленні аднаўляе цэлы тэатр жывых і дзеючых вобразаў» [1, с. 45]. Сама канструкцыя літаратурнага матэрыялу, якая ляжыць у аснове дзейнасці расказчыка, патрабуе нястомнай работы ўяўлення, пастаяннага аднаўлення падзей і з'яў у памяці прамоўцы, што стварае найлепшыя ўмовы для бесперапыннай «кінастужкі бачанняў». Кожнае вымаўленае слова «...павінна быць вынікам вернага жыццеўяўлення» [7, с. 90]. Акрамя гэтага, бачанне расказчыка заўсёды цэласнае, гэта значыць, фарміруецца як дынамічныя ўспаміны імгненняў ці эпізодаў

жыццёвага вопыту і комплекс адчуванняў і прадстаўленняў аб прадмеце па арыенцірах, указаных аўтарам. Працэс стварэння бачання насычае маўленне жывымі чалавечымі эмоцыямі, выяўляе ўсю творчую прыроду выканаўцы. Чым паўней, яскравей бачанне, чым больш поўна суадносіцца яно з эмацыянальным вопытам студэнта, тым мацней адгукнецца пачуццё ў яго разнастайных уражаннях: і зрокавых, і слыхавых, і рухальных і г. д. Такім чынам, працэс працы над тэкстам – ад асэнсаванага выбару да ўвасаблення на пляцоўцы, развівае ўяўленне выканаўцы па ўсіх напрамках.

Вуснае мастацкае слова ўмацоўвае волю і ўвагу студэнтаў. Мастацкае чытанне не аднабаковае дзеянне, бо ў працэсе дэкламацыі выканаўца прыцягвае да творчасці слухачоў, актыўна ўздзейнічае на іх пачуцці, розум, волю, якія з'яўляюцца «рухавікамі нашага псіхічнага жыцця» [8, с. 299]. Галоўная асаблівасць мастацтва расказчыка заключана ў непасрэдных зносінах са слухачом і гледачом, у прамым уздзеянні на іх. Гэта асаблівасць вымушае выканаўцу траціць многа намаганняў, выкарыстоўваць дадатковыя псіхалагічныя сродкі для прыцягнення ўвагі залы, поўнага авалодання гэтай увагай і захавання падтрымкі свайго асабістага адчування, без якога немагчыма творчасць. Пераадольванне перашкод на шляху дасягнення мэты чытальніка выконвае галоўную ролю ў развіцці волі. Слоўнае дзеянне расказчыка адбываецца ва ўмовах, патрабуючых пераадолення розных шматлікіх перашкод, таму ў цэлым уяўляецца як згустак валявой актыўнасці.

Адной з асноўных умоў утрымання ўвагі гледачоў і слухачоў з'яўляецца разнастайнасць аб'ектаў апавядання.

У творчасці расказчыка змена гэтых аб'ектаў ажыццяўляецца выключна ва ўяўленні, у розуме выступоўцы, што складае незвычайную цяжкасць як у плане выканальніцтва, так і ў плане ўспрыняцця мастацтва апавядальнасці. Акрамя таго, ініцыятыва ўзаемадзеяння з партнёрам-слухачом належыць выканаўцы, які адзін ажыццяўляе так званае «наступленне». І для таго, каб яно было максімальна мэтанакіраваным, пераканаўчым і цікавым, расказчыку неабходна прыкласці вялікую колькасць намаганняў, «…бо дзейнічаць з мінімальнымі затратамі намаганняў можна не наступаючы; наступаць, не затрачваючы ўсё большых і большых намаганняў, немагчыма»

[7, с. 68]. Такім чынам, можна сцвярджаць, што моўнае дзеянне, накіраванае непасрэдна на слухачоў і гледачоў, стварае найлепшыя ўмовы для выхавання актыўнасці, ініцыятывы, волі, увагі студэнтаў.

Аднаўленне думак і пачуццяў аўтара ў жывым слове выхоўвае эмацыянальна-пачуццёвую сферу будучых рэжысёраў свят. Вядома, што любы мастацкі твор вырастае з вялікага пачуцця пісьменніка. Але ў выканальніцкім мастацтве пачуццё пісьменніка здольна авалодаць аўдыторыяй праз пачуццё расказчыка, бо перадаецца толькі праз эмоцыю. «Прынцыпова важным у гэтай справе з'яўляецца і асобаснае перажыванне студэнта, выкліканае прачытаным тэкстам. На пачатковым этапе асобае значэнне мае першасная ацэнка прачытанага, водгук душы, эмацыянальныя адносіны будучага мастака да зместу літаратурнага тэксту» [2, с. 70]. Будучы рэжысёр свят на працягу навучання засвойвае розныя віды і жанры літаратурнай творчасці (фальклор, эпас, паэзію, публіцыстыку), дзякуючы чаму павялічваецца яго эмацыянальная чуласць. Акрамя таго, агучанае слова садзейнічае выхаванню не толькі чалавечых пачуццяў увогуле і эстэтычных у асаблівасці, але і выконвае істотную ролю ў фарміраванні вышэйшых сацыяльных якасцей студэнта, такіх як пачуццё абавязку, гонару, адказнасці, патрыятызму і г. д. Ад моцнай аўтарскай думкі і сваіх эмоцый прамоўца твора вырастае да сааўтарства, якое вызваляе яго ад дробнаэгаістычнага і надае выкананню сацыяльны, грамадскі характар. У гэтым асноўная асаблівасць уздзеяння мастацкага слова на эмацыянальна-пачуццёвую сферу будучага рэжысёра свят.

Такім чынам, праца над аналізам і ўвасабленнем розных літаратурных жанраў ва ўсёй паўнаце творчых задач, якая ажыццяўляецца на занятках па мастацкім чытанні, выступае найважнейшым звяном у сістэме цэласнага навучання і выхавання прафесійных кампетэнцый будучага рэжысёра свят (тэатралізаваных прадстаўленняў).

1. *Артоболевский, Г. В.* Художественное чтение : книга для учителей и руководителей художественной самодеятельности / Г. В. Артоболевский; сост. и автор вступ. части К. Лубенская. – М. : Просвещение, 1978. – 240 с.

2. *Каляда, А.* Сцэнічная мова : навуч. дапам. / А. Каляда, А. Шагідзевіч. – Мінск : Выш. шк., 1993. – 170 с.

3. *Петрова, Э. А.* Художественное слово в обучении режиссера / Э. А. Петрова. – Л. : Ленингр. гос. ин-т культуры, 1974. – 24 с.

4. *Сарабьян, Э.* Актерский тренинг по системе Станиславского. Речь. Слова. Голос. Максимальная достоверность и убедительность / Эльвира Сарабьян. – М. : АСТ, 2010. – 160 с.

5. *Сащеко, В. В.* Техника речи : практикум / В. В. Сащеко, Д. Г. Тытюк. – Минск : БГУКИ, 2012. – 66 с.

6. *Станиславский, К.* Искусство представления. Классические этюды актерского тренинга / К. Станиславский ; сост. и подгот. текста А. Гиппиус. – СПб. : Азбука, 2013. – 189 с.

7. *Станиславский, К. С.* Собр. соч. : в 8 т. / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1954. – Т. 2 : Работа актера над собой. – Ч. I : Работа над собой в творческом процессе переживания. – 422 с.

8. *Станиславский, К. С.* Собр. соч. : в 8 т. / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1954. – Т. 3 : Работа актера над собой. – Ч. II : Работа над собой в творческом процессе воплощения. – 343 с.

УДК 378.147: 808. 55

***Е. Н. Акулёнок,***
*доцент кафедры театрального творчества*
*учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

## ИННОВАЦИОННЫЕ МЕТОДЫ ПРЕПОДАВАНИЯ УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЫ «СЦЕНИЧЕСКАЯ РЕЧЬ»

**Аннотация.** Рассматриваются инновационные методы преподавания сценической речи с активным использованием современных технологий, благодаря которым увеличивается возможность наиболее результативного закрепления практических речевых навыков и умений, приобретенных в процессе обучения. Использование современных компьютерных технологий в преподавании дисциплины «Сценическая речь» способствует получению важной дополнительной теоретической информации. Инновационные методы помогают найти естественный путь превращения студентов в активных участников учебного процесса и создают условия для достаточно высокого уровня профессиональной подготовки в области речевого искусства.

**Ключевые слова:** сценическая речь, инновационные методы, современные технологии; визуальные, аудиальные средства наглядности; видеоаппаратура, компьютер.